9(476)/(075.8)
Г 916
полка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ




## Частка 4

## Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

***Вучэбна-метадычны дапаможнік***

**У пяці частках**

***Частка 4***

*Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК-4463

Мінск 2009

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4 Беи)я 73
Г516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ, рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук (пратакол № 16 ад 20.01.09)

Праца выканана ў рамках тэм «Заканадаўчы вопыт Расійскай імперыі пачатку XX ст. пры фарміраванні парламенцкіх інстытутаў Рэспублікі Беларусь» і «Эвалюцыя саслоўнага і бессаслоўнага самакіравання ў Беларусі. 1861–1917 гг.», уключаных у Дзяржаўную комплексную праграму навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» («Гісторыя і культура»)

*Аўтары:*
доктар гістарычных навук, прафесар БДПУ *А.П. Жытко*;
доктар гістарычных навук, прафесар БДПУ *М.М. Забаўскі*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДПУ *А.Ф. Рацько*
начальнік вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*;
старшы выкладчык БДПУ *І.І. Забаўская*;
выкладчык БДПУ *Т.В. Грышкевіч*;
аспірант БДПУ *І.Г. Гушчынскі*;

*Рэцэнзенты:*
кафедра гісторыі Беларусі БДПУ (пратакол № 7 ад 14.02.08);
доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ *М.Я. Сяменчык*

**Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму: вучэб.-метад. дапам. У 5 ч.
Г516 Ч. 4. Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А.П. Жытко, М.М. Забаўскі, А.Ф. Рацько і інш. – Мінск : БДПУ, 2009. – 168 с.

ISBN 978-985-501-699-2.

У дапаможніку асвятляюцца найважнейшыя рэформы другой паловы XIX – пачатку XX ст. у галіне сістэмы кіравання, суда, сацыяльнай сферы, культуры і ваеннай справы.

Адрасуецца навукоўцам, настаўнікам і студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6 (075.8)**
**ББК 63.3 (4 Беи)я73**

**ISBN 978-985-501-699-2** (ч. 4)
**ISBN 978-985-501-083-9**
**ISBN 985-501-083-3**

© БДПУ, 2009

# УВОДЗІНЫ

Рэформы 60–70-х гг. XIX ст. – важны гістарычны этап прагрэсіўнага значэння. Іх рэалізацыя была значным крокам на шляху фарміравання грамадзянскага грамадства ў Расійскай імперыі. Разам з гэтым Расія паступова замацоўвала трывалае становішча сярод буйнейшых сусветных дзяржаў. Расійскія рэформы хаця і мелі лакальнае значэнне, але ў той жа час уяўляліся рэгіянальнай праявай агульнага гістарычнага працэсу. У той ці іншай формах у розных краінах свету адбывалася паступовая ліквідацыя феадальнай залежнасці сялян, саслоўнага нераўнапраўя, ствараліся выбарныя ўсесаслоўныя інстытуты мясцовага кіравання і самакіравання. На прынцыпах усесаслоўнасці праводзіліся рэформы ў галіне адукацыі, суда, ваеннай справы. Такім чынам, лібералізацыі падвергліся ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства.

Разам з тым гістарычны працэс не з'яўляецца лінейным, паступальна-прагрэсіўным. Звычайна пасля значнага ўздыму ў любой сацыяльнай сферы наступае перыяд спаду, адкату назад, але не ў такой ступені, каб вярнуцца да першапачатковага стану. Аб гэтым сведчаць і мерапрыемствы царскага ўрада ў 80–90-х гг. XIX ст. у тых напрамках, якія закранулі рэформы папярэдняга дваццацігоддзя.

Правядзенне рэформ у Беларусі мела свае асаблівасці, якія былі выкліканы шырокім спектрам прычын. Важнейшыя з іх – нелаяльнасць большай часткі вышэйшага саслоўя Беларусі да царызму, якая праяўлялася як у адкрытай форме (напрыклад, паўстанне 1863–1864 гг.), так і ў тайнай – абсентэізм. Большасць заможнага зямельнага дваранства краю была рымска-каталіцкага веравызнання, у выніку гэтага царская адміністрацыя адносіла іх да палякаў. У Беларусі, у адрозненне ад цэнтральных губерняў Расіі, урад імкнуўся, хаця і непаслядоўна, проціпаставіць сялян памешчыкам (рэалізацыя рэформы 1861 г., выбарчая сістэма ў органы земскага самакіравання 1911 г. і г. д.). Акрамя гэтага, у Беларусі гандлёвая і прамысловая буржуазія пераважна была яўрэйскай, якая зведвала нацыянальны ўціск з боку ўрада. Нягледзячы на правядзенне актыўнай русіфікатарскай палітыкі, царызму не ўдалося канчаткова інтэграваць Беларусь у склад Расійскай імперыі. Таму частка рэформ, асабліва тых, якія тычыліся суда і мясцовага самакіравання, праводзілася ў краі са спазненнем на 5–27 гадоў і, звычайна, ва ўрэзанай форме.

У цэлым рэалізацыя рэформ у Расіі насіла супярэчлівы, непаслядоўны характар. Нават ліквідацыя абсалютызму і ўсталяванне думскай манархіі падчас Першай расійскай рэвалюцыі не выратавала Расію ад Другой рэвалюцыі.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. нараўне з былымі панскімі сялянамі, якія складалі асноўную масу вясковага насельніцтва, было праведзена рэфармаванне іншых, невялікіх саслоўных груп сялян – казённых, удзельных, вольных людзей, старавераў, сельскіх чыншавікоў, панцырных баяр, праваслаўных арандатараў, аднадворцаў і інш., у выніку чаго адбылася саслоўная уніфікацыя сельскіх абывацелей.

Земствы былі першым рэальным крокам самадзяржаўя на шляху палітычнай перабудовы Расійскай імперыі. Аднак гэта намаганне, як і іншыя палітычныя і грамадскія рэформы, што праводзіліся «зверху», мела абмежаваны характар і ахоплівала далёка не ўсю тэрыторыю дзяржавы.

На землі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны палажэнні аб земскай рэформе не распаўсюджвалася. Справа ў тым, што як на выбарах, так і ў земскіх установах асноўнай кіруючай фігурай, паводле задумы ўлад, павінны былі стаць мясцовыя памешчыкі. Аднак пасля паўстання (1863–1864 гг.) царскі ўрад палітычна не давяраў мясцовым памешчыкам «польскага» паходжання. Толькі ў 1911 г. земскае палажэнне ад 12 чэрвеня 1890 г. было ўведзена ў трох беларускіх губернях – Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай. Пры гэтым у адрозненне ад расійскіх губерняў у Беларусі замест саслоўных курый уводзіліся нацыянальныя «рускія» і «польскія», каб забяспечыць перавагу праваслаўных памешчыкаў у органах земскага самакіравання. Нягледзячы на дыскрымінацыйны характар выбараў, земствы ў трох беларускіх губернях змаглі станоўча паўплываць на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёну.

Першым крокам да судовай рэформы стала ўвядзенне ў чэрвені 1860 г. інстытута судовых следчых, дзякуючы чаму следчыя справы перайшлі ад паліцыі да судовага ведамства. Згодна з судовымі статутамі, зацверджанымі Аляксандрам II 20 лістапада 1864 г., суд абвяшчаўся публічным і з незалежнымі ад ўрада суддзямі. Незалежнасць суддзяў забяспечвалася іх выбарнасцю, нязменнасцю, забаронай пераводу на іншае месца без асабістай згоды. Кандыдаты на судовыя пасады павінны былі мець адпаведныя адукацыйны і службовы цэнзы. Для ўсіх саслоўяў уводзіўся адзіны акруговы суд. У судовым працэсе прадугледжваўся ўдзел адвакатаў. Дзеля гэтага ствараўся спецыяльны інстытут прысяжных павераных. Яны выконвалі адвакацкія абавязкі ў судовых справах па крымінальных злачынствах і па грамадзянскіх справах.

Для разгляду дробных злачынстваў і нязначных па памерах іскаў быў створаны міравы суд са спрошчаным судаводствам. Міравыя суддзі выбіраліся на земскіх і гарадскіх сходах гласных. Рашэнні міравых суддзяў маглі быць апратэставаны ў павятовы суд міравых суддзяў.

Найбольш важныя справы разглядалі акруговыя суды, якія падзяляліся на грамадзянскія і крымінальныя. Састаў акруговага суда назначаўся імператарам па прад-

стаўленні міністра юстыцыі. Апеляцыйнай інстанцыяй для акруговых судоў служылі судовыя палаты, якія стаялі на чапе судовых акругоў. Вышэйшай судовай інстанцыяй прызначаўся Сенат.

Судовая рэформа ў Беларусі была праведзена са значным спазненнем і адступленнямі ад палажэння 1864 г. У 1872 г. тут былі ўведзены міравыя суды. Аднак беларускія губерні не мелі земскіх ўстаноў, на якіх, згодна з палажэннем 1964 г., выбіраліся міравыя суддзі. Таму на гэтыя пасады міністрам юстыцыі назначаліся тыя, у чыёй палітычнай добранадзейнасці была ўпэўнена мясцовая адміністрацыя. Такім чынам, судовая рэформа ў Беларусі была пазбаўлена адной з істотных адзнак – выбарнасці суддзяў.

Акруговыя суды, судовыя палаты, пракуратура і адвакатура ў асобах прысяжных паверапых у беларускіх губернях таксама былі ўведзены са спазненнем, ужо пасля значнага звужэння царызмам судовай рэформы1864 г. Толькі ў 1883 г. была ўтворана Віленская судовая папата, якая стаяла на чале акруговых судоў Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губерняў. Акруговы суд Віцебскай губерні падпарадкоўваўся Пецярбургскай судовай палаце, Магілёўскай губерні – Кіеўскай судовай палаце.

З 1878 г. разгляд спраў аб антыўрадавых выступленнях быў перададзены з суда прысяжных у судовыя палаты і нават, у выключных выпадках, у ваенныя суды. Законы ад 12 чэрвеня 1884 г. і 28 красавіка 1887 г. павялічылі адміністрацыйны нагляд за фарміраваннем складу прысяжных. Закон ад 12 лютага 1887 г. фактычна адмяніў публічнасць суда і даў міністру юстыцыі права паводле свайго меркавання абвяшчаць судовыя пасяджэнні закрытымі.

Пасля земскай рэформы ўлады пайшлі на стварэнне новых форм гарадской адміністрацыі. 18 чэрвеня 1870 г. было выдадзена гарадавое палажэнне, якое ўвяло ўсесаслоўнае мясцовае самакіраванне ў гарадах. Па прускім прыкладзе ўсе жыхары, якія плацілі гарадскія падаткі, падзяляліся на тры групы ў адпаведнасці з памерамі гэтых падаткаў. Кожная група выбірала ў гарадскую думу аднолькавую колькасць гласных. Гласныя гарадской думы выбіралі са свайго асяроддзя гарадскога галаву і членаў гарадской управы. У негубернскіх гарадах асобы, абраныя на пасаду гарадскога галавы, зацвярджаліся губернатарамі, а ў губернскіх – міністрам унутраных спраў.

Гарадская дума збіралася па меры неабходнасці, а гарадская ўправа дзейнічала як пастаянны выканаўчы орган. Быў усталяваны чатырохгадовы тэрмін паўнамоцтва гласных. За дзейнасцю гарадскіх дум і ўпраў назірала губернскае па гарадавых справах «установа» пад старшынствам губернатара.

Новае Гарадавое палажэнне, прынятае 11 чэрвеня 1892 г., у цэлым захоўвала старыя прынцыпы гарадскога самакіравання, але значна павысіла маёмасны цэнз для выбаршчыкаў, адхіляла ад удзелу ў дзейнасці органаў самакіравання асоб іудзейскага веравызнання, што істотна скараціла іх колькасць у Беларусі.

Падобна іншым рэформам, напрамак у бок усесаслоўнасці мелі і рэформы ў галіне адукацыі. Школьная рэформа праводзілася паводле «Палажэння аб пачатковых народных вучылішчах» і Статута гімназій і прагімназій 1864 г. Сетка пачатковых школ пашыралася. Сярэднюю адукацыю давалі класічныя і рэальныя гімназіі (з 1871 г. пераўтвораны ў рэальныя вучылішчы, тэрмін навучання ў іх быў скарочаны з 7 да 6 гадоў). Выпускнікам класічных гімназій давалася права паступлення ва універсітэты без уступных экзаменаў, рэальных гімназій – у тэхнічныя інстытуты. Універсітэцкая рэформа тычылася беларускіх зямель ускосна, бо яны на той час не мелі вышэйшых навучальных устаноў. З 1862 г. аднавілася практыка замежных камандзіровак за дзяржаўны кошт для універсітэцкіх вучоных. У 1863 г. урад выдаў новы універсітэцкі статут, згодна з якім універсітэты атрымалі шырокую аўтаномію. Савет прафесараў меў права выбіраць усіх службовых асоб універсітэцкай адміністрацыі і прафесараў на вакантныя пасады. Пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы адмяняліся саслоўныя абмежаванні. У 70-х гг. пачалі дзейнічаць першыя прыватныя вышэйшыя жаночыя курсы з праграмамі універсітэцкага навучання.

З канца 60-х гг. урад пачаў рабіць захады па абмежаванні рэформ у галіне адукацыі. За пачатковай школай быў узмоцнены адміністрацыйны нагляд. З гэтай мэтай у 1869 г. уводзілася пасада інспектара народных вучылішч, у 1874 г. – дырэктара народных вучылішч. 13 чэрвеня 1884 г. было выдадзена палажэнне аб царкоўнапрыходскіх школах. Яны засноўваліся нараўне з земскімі і падпарадкоўваліся духоўнаму ведамству.

У пачатку 70-х гг. былі зроблены захады з мэтай абмежаваць доступ да сярэдняй і асабліва вышэйшай адукацыі асобам недваранскага паходжання, а таксама прадстаўнікам рымска-каталіцкага і іудзейскага веравызнанняў.

«Правілы» для студэнтаў імперскіх расійскіх універсітэтаў, прынятыя ў 1879 г., ставілі студэнцтва пад жорсткі кантроль. У 1884 г. новы універсітэцкі статут знішчыў універсітэцкую аўтаномію. Згодна з ім, рэктары універсітэтаў прызначаліся ўрадам, тое ж датычылася і прафесараў. Праграмы выкладання павінны былі зацвярджацца Міністэрствам народнай асветы, для кантролю за паводзінамі студэнтаў стваралася асобая інспекцыя.

У цэлым, нягледзячы на абмежаванні, рэформы ў галіне адукацыі аб'ектыўна спрыялі пашырэнню пісьменнасці, павелічэнню колькасці спецыялістаў з сярэднім і вышэйшым адукацыйным цэнзам, развіццю навукі і культуры.

6 красавіка 1865 г. былі зацверджаны часовыя Правілы аб друку. Яны адмянялі папярэднюю цэнзуру для арыгінальных твораў памерам не менш чым 10 друкаваных аркушаў, для перакладаў – 20 друкаваных аркушаў. Кніжныя выданні меншых памераў, што прызначаліся для шырокага кола чытачоў, павінны былі праходзіць папярэднюю цэнзуру. Перыядычныя органы друку маглі быць вызвалены ад папярэдняй цэнзуры пры ўмове ўнясення вялікага грашовага закладу і пасля атрымання

спецыяльнага дазволу міністэрства ўнутраных спраў. Выдаўцы і рэдактары вызваленых ад папярэдняй цэнзуры перыядычных выданняў неслі адказнасць толькі праз суд. Аднак асобныя правілы прадугледжвалі ў некаторых выпадках адміністрацыйныя спагнанні на перыядычныя органы друку аж да забароны іх выдання. Аднак яны датычыліся толькі тых, якія знаходзіліся ў Пецярбурзе і Маскве, а для правінцыяльных газет і часопісаў па-ранейшаму існавала папярэдняя цэнзура.

У Беларусі ў 60-я гг. XIX ст. дзейнічалі палажэнні асобных цыркуляраў Віленскіх генерал-губернатараў М. Мураўёва і К. Каўфмана, згодна з якімі друк поўнасцю аддаваўся пад нагляд і кантроль мясцовай адміністрацыі. Толькі ў 1869 г. было вырашана скасаваць некаторыя надзвычайныя меры і распаўсюдзіць на беларускія губерні агульныя законы аб друку.

Ваенныя рэформы сталі падмуркам перабудовы царскай арміі і флоту. На тэрыторыі імперыі былі ўтвораны 15 ваенных акруг. Беларускія губерні ўвайшлі ў склад Віленскай ваеннай акругі. Пашырылася сетка ваенных вучылішч, кадэцкія корпусы пераўтвараліся ў ваенныя гімназіі, з 1864 г. ствараліся юнкерскія вучылішчы.

1 студзеня 1874 г. была ўведзена ўсеагульная воінская павіннасць. Выключэнне складала карэннае насельніцтва Сярэдняй Азіі, Казахстана, Сібіры, Поўначы і Вялікага княства Фінляндскага. Вызваляліся ад вайсковай службы тыя маладыя людзі, якія з'яўляліся адзінымі кармільцамі ў сям'і, хрысціянскае і мусульманскае духавенства, вучоныя і некаторыя іншыя нязначныя па колькасці катэгорыі насельніцтва. Асобы іудзейскага веравызнання не падлягалі прызыву на флот. Адбор празыўнікоў вёўся па жараб'ёўцы, астатнія залічваліся ў апалчэнне. На вайсковую службу пападала прыкладна трэцяя частка мужчын прызыўнога ўзросту. Была магчымасць пайсці на вайсковую службу і добраахвотна. Тэрмін абавязковай службы ў арміі складаў шэсць, на флоце – сем гадоў. Пры наяўнасці адукацыйнага цэнзу тэрмін службы зніжаўся.

Звольненыя ў запас складалі мабілізацыйны рэзерв: дзевяць гадоў у арміі і тры гады на флоце. Істотным момантам з'яўлялася тое, што з 1875 г. непісьменныя за гады вайсковай службы абавязкова вучыліся грамаце.

Увядзенне ўсеагульнай воінскай павіннасці і паслядоўнае правядзенне вайсковай рэформы зрабілі яе найбольш удалай і дасканалай сярод усіх рэформ 60–70-х гг. XIX ст.

Увядзенне рэжыму контррэформ амаль не закранула беларускія губерні, бо большасць рэформ 60–70-х гг. уводзілася ў Беларусі са спазненнем і значнымі абмежаваннямі. Такім чынам, магчыма меркаваць, што Беларусь, якая не зведала рэформы ў поўным памеры, адразу сутыкнулася з контррэформамі.

# Змест


**Уводзіны (А.П. Жытко)** ........ **3**

**Глава 1. АГРАРНЫЯ РЭФОРМЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.** ........ **4**

1.1. Гістарыяграфія праблемы (А.Ф. Рацько) ........ 4

*Літаратура* ........ *9*

1.2. Сацыяльна-прававое становішча дзяржаўных, удзельных сялян і іншых сельскіх абывацелей (А.П. Жытко) ........ 12

*Літаратура* ........ *25*

**Глава 2. КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНЫЯ РЭФОРМЫ** ........ **40**

2.1. Універсітэцкі статут 1863 г. (І.І. Забаўская, М.М. Забаўскі) ........ 40

2.2. Рэформы школы (1860–1920-я гг.) (І.І. Забаўская) ........ 41

*Літаратура* ........ *46*

2.3. Цэнзурная рэформа 1865 г. (І.І. Забаўская) ........ 47

**Глава 3. СУДОВАЯ, ВАЕННЫЯ, ГАРАДСКАЯ РЭФОРМЫ** ........ **49**

3.1. Судовая рэформа (пачатак 60-х гг. XIX ст. – канец XIX ст.) (І.Г. Гушчынскі, А.П. Жытко) ........ 49

*Літаратура* ........ *55*

3.2. Ваенныя рэформы (канец 50 – пачатак 70-х гг. XIX ст.) (М.М. Забаўскі) ........ 65

3.3. Увядзенне гарадскога самакіравання ў краі (Т.В. Грышкевіч, А.П. Жытко) ........ 67

*Літаратура* ........ *102*

**Глава 4. РЭФАРМАВАННЕ ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ Ў ПАЧАТКУ XX ст.** ........ **134**

4.1. Палітычны выбар у 1906 г. (М.М. Забаўскі) ........ 134

4.2. Сталылінскія палітычныя рэформы (М.М. Забаўскі) ........ 147

4.3. Грамадска-палітычная барацьба вакол увядзення земстваў у Беларусі (В.Я. Навагродскі) ........ 149

*Літаратура* ........ *160*

**Заключэнне (А.П. Жытко)** ........ **162**

Вучэбнае выданне

**Жытко** Анатолій Паўлавіч
**Забаўскі** Мікалай Міхайлавіч
**Рацько** Аляксандр Фёдаравіч і інш.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

***Вучэбна-метадычны дапаможнік***

***У пяці частках***

***Частка 4***

*Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

*Рэдактар* Л.М. Каранеўская
*Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютэрная вёрстка* К.Б. Капуста

Падпісана ў друк 05.03.09. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура *Арыял.*
Друк Riso. Ум.-друк. арк. 9,77. Ул.-выд. арк. 13,27. Тыраж 150 экз. Заказ 170

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
ЛВ № 02330/0133496 ад 01.04.04.
ЛП № 02330/0131508 ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.